# Новые Рэспублікі на Усходзе.

Украінская газэта „Впэрэд!" у № 106 дае цікавую статыстыку аб новых Рэспубліках на Усходзе.

**Украіна**: 800,000 км. $^{2}$—45,000,000 мяшканцау, з іх 72 проц. украінцау.

**Беларусь**: 300,000 км. $^{2}$—14,075,000 мяшканцау, з іх 70 проц. беларусау.

**Літва**: 125,000 км. $^{2}$ — 6,000,000 мяшканцау.

**Эстонія** 47,500 км. $^{2}$ — 1,750,000 мяшканцау, з іх 72 проц. эстонцау.

**Латвія**: 64,196 км. $^{2}$ — 2,552,000 мяшканцау, з іх 72 проц. латышоу.

**Пауночны Кауказ**: 150,000 км. $^{2}$— 4,300,000 мяшканцау.

**Аззрбейджан**: 100,000 км. $^{2}$ — 4,500,000 мяшк. з іх 75 проц. турко татар.

**Грузія**: 90,000 км. $^{2}$ — 3,000,000 мяш., з іх 75 проц. грузінау.

**Арменія**: 320,000 км. $^{2}$—4,000,000 мяшк., з іх 75 проц. армянцау.

# МЕНСКАЕ ЖЫЦЬЦЕ.

**Пасьвядчэньні аб чыстаце і здароуі**, якіе вымагаюцца білетнымі касамі на чыгунцы, выдаюцца штодзенна ад 12—3 гадз. у дзень дохтарам (Подгорная 14) на дзядзінцу управленьня акружнага камісара.

Збор за пасьвядчаньне—3 руб.

**Выехалі у Варшаву** 1-га кастрычніка старшыня Бел. Вайск. Камісіі, П. Аляксюк, і сэкратар Бел. Нац. Камітэту, А. Аусянік, па пытаньню аб стварэньні беларускага нацыянальнага войска.

**Памешканьні і пакоі** даражэюць у месьце з кожным днем, з прычыны дарагоулі на апал.

Пакоі у цэнтры места цэняцца ад 300 р. да 500 р. у месяц з асьвятленьнем і апалам.

**Сахарын**, з прычыны вострага недахватку цукру (57—60 руб. ф.), прадаецца па 2½ руб. грам. Першая партыя цукру прыбудзе у Менск 7-га кастрычніка.

**Апал**. Акружным камісарам адпускаецца аддзелу апалу пры магістраце 1,000,000 рублеу на загатоуку дроу.

Дзеле высокіх ставак на дровы (1000—1200 руб. саж.), у аддзеле апалу запісываюцца толькі заможные людзі.

## УСПАМІН.

Вось тая дарога! Вось цемны той бор,
Дзе жыу я, радзіуся, гуляу і узрос,
Вось хата малая, што бацькау тапор
Паставіу, а часы і вецер растрос.
Тут кожная траука, тут кожны кусток
Аб лепшых, далекіх часох мне пяюць!
Тут кожная кветка, пажоуклы лісток
Жывым успамінам у сэрцы устаюць.
Памалу я бліжай пад бор падышоу,
І шум таго бору, што некалі чуу,
Пануры і ціхі пачуу я ізноу,
І сэрцо, душу ен ва мне скалыхнуу.
І хвілі, што тут я пад ценем сасон
Шчэ двецем у гулях калісь-то правеу,
Здаюцца цяпер мне, як быццам-то сон.
З далекіх і мілых уцекшых вякоу...
О, вы перажыткі, як многа далі
І гора, сардэчнага болю і сьлез,
На што вы мяне ад бацькоу аднялі
І сэрцо зьмянілі у каменны стос?!

**Габрыэль Эмга.**

*Рэдактар-выдавец*
*Ядв. ЛУЦЭВІЧ.*